ДУ “МІНСКАЯ РАЁННАЯ
ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА”

# Уладзімір КАРЫЗНА:
# “Сапраўдных паэтаў шмат не бывае...”



**Рэкамендацыйна-бібліяграфічны паказальнік
да 85-годдзя з дня нараджэння**

Міханавічы, 2023

**«Уладзімір Карызна: «Сапраўдных паэтаў шмат не бывае...»** [Текст]: Рэкамендацыйна-бібліяграфічны паказальнік / складальнік Н. Носова; рэд. Н.Няхай; мастак-аф. М.Янус; аддзел інфармацыйнага абслугоўвывання ДУ “Мінская раённая цэнтральная бібліятэка”. – Міханавічы. — 2023. — 8 с.

Рэкамендацыйна-бібліяграфічны паказальнік, прысвечаны 85-годдзю з дня нараджэння аднаго з самых музычных і меладычных паэтаў, творы якога нязменна карыстаюцца поспехам не толькі ў чытачоў, але і кампазітараў – Уладзіміру Карызне. Ён — адзін з аўтараў гімна Рэспублікі Беларусь, шматлікіх паэтычных зборнікаў і паэм, рамансаў, песень і хораў, кніг для дзяцей, таленавіты перакладчык.

Прызначаны для шырокага колу чытачоў.

*“Паэзіі без шчырасці, адкрытасці, нават у чымсьці наіўнасці не можа быць. Усё геніяльнае — простае і ў той жа час глыбокае, як сама прырода... Сапраўдны паэт спасцігае гэтую глыбіню, перадае словамі сутнасць прыроды... Калі піша вершы, ён усяго сябе раскрывае людзям, як самым блізкім сваім сябрам. Таму што калі ён так не раскажа, то слухаць не будуць, чытаць не будуць...”*

Гэтыя словы належаць вядомаму беларускаму паэту заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь Уладзіміру Карызну. Ён — адзін з аўтараў Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і прэміі прафсаюзаў Беларусі, узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Ім выпушчана каля трыццаці кніг, сярод якіх “Жураўліны досвітак”, “Святло ліўня”, “Цеплыня”, “Цішыня баразны”, “Музыка ў свеце” і іншыя.




Адным з самых музычных і меладычных паэтаў, творы якога нязменна карыстаюцца поспехам не толькі ў чытачоў, але і кампазітараў, з'яўляецца Уладзімір Карызна. Ён — адзін з аўтараў гімна Рэспублікі Беларусь, шматлікіх паэтычных зборнікаў і паэм, рамансаў, песень і хораў, кніг для дзяцей, таленавіты перакладчык.

Уладзімір Іванавіч Карызна нарадзіўся 25 мая 1938 г. у вёсцы Закружка Мінскага раёна ў сялянскай сям'і, яго бацька і маці (Іван Ціханавіч і Ніна Канстанцінаўна) вылучаліся схільнасцю да музычнай творчасці.

Вайна і партызанскі лес, а пасля папялішча роднай хаты надоўга засталіся ў памяці хлапчука.



Пасля заканчэння Крупіцкай сярэдняй школы ў 1956 г. Уладзімір Іванавіч вучыцца на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна (1956—1961). Побач з вучобай малады філолаг актыўна наведваў пастаянна дзеючы семінар самадзейных кампазітараў пры Саюзе кампазітараў Беларусі, дзе выкладалі знакамітыя кампазітары-творцы Рыгор Пукст і Генрых Вагнер.

Пасля заканчэння БДУ У.Карызна працаваў настаўнікам Опсаўскай сярэдняй школы Браслаўскага раёна (1961—1967), старшым рэдактарам, загадчыкам аддзела беларускай музыкі на Рэспубліканскім радыё (1967—1980), рэдактарам аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя» (1980—1981), старшым рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі літаратуры для дашкольнікаў выдавецтва «Юнацтва» (1981—2001), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Крыніца» (2002).

Творчы дэбют пісьменніка адбыўся ў 1956 г., калі ў газеце «Чырвоная змена» быў апублікаваны першы верш. І гэты пачатак быў вельмі шматабяцаючым: У.Карызна — аўтар шматлікіх зборнікаў, сярод якіх «Край мой сінявокі» (1963), «Жураўліны досвітак» (1969), «Святло ліўня» (1972), «Цеплыня» (1977), «Цішыня баразны» (1981), «Шумяць вербы» (1981), «Музыка ў свеце» (1985), «Расколіна на Звоне Свабоды» (1986), «Душы разгуканай мелодыя» (1988), «Зямля — два паўшар'і» (1988), «Мір і сонейка — для ўсіх» (1990), «Азёры дабрыні» (1995), «На азёрах сініх» (2000), «Хвіліна святла» (2000, 2003), «Чароўнае вочка» (2003), «Доля Русь наша Белая» (2007), «Лепяць ластаўкі гняздзечкі» (2010), «Зарніцы дзяцінства» (2014) і інш.

Вышэй ужо гаварылася пра меладызм вершаў У.Карызны, ён прызнаны ў рэспубліцы паэт-песеннік, больш за 200 яго вершаў пакладзена на музыку лепшымі беларускімі кампазітарамі: Ю.Семянякам, Я.Глебавым, Д.Смольскім, І.Лучанком, Э.Ханком, Л.Захлеўным, Э.Зарыцкім, У.Карызнам-малодшым і інш.

Садружнасць талентаў адораных кампазітараў і паэта прадвызначыла папулярнасць песень «Люблю цябе, Белая Русь», «Дом, дзе мы радзіліся», «Журавінка», «Песня родная», «Хаджу сунічным і барамі», «Песня аб роднай зямлі», «Салавей спявае», «Мамін а вішня», «Азёры дабрыні», «Зорачка мая», «На азёрах сініх», «Калі цябе сустрэў», «Мы прыйшлі з перамогаю» ў слухачоў.

Зборнікі песень з нотамі на словы паэта «Клубныя вечары» (1978), «Люблю цябе, Белая Русь» (1984), «Салавей спявае» (1990), «Гэта наша Радзіма» (1998) карыстаюцца папулярнасцю ў народных вакальных калектываў, а песні «Беларусь мая сінявокая», «Гады маладыя», «Даўно ў той хаце не была» з'яўляюцца неад'емнай часткай рэпертуару Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору імя Г. І. Цітовіча.

У. Карызна адносіцца да паэтаў, якія ўступілі ў літаратурнае жыццё ў 1960—1970-я гады. Гэта так званае філалагічнае пакаленне — паэты і пісьменнікі, якія вучыліся на філалагічных і журналісцкіх факультэтах. Дзяцінства іх прыйшлося на ваенныя гады, трагічнасць якіх назаўсёды ўрэзалася ў іх памяць і душы.

1963 год быў знамянальным для У. Карызны: менавіта тады выйшаў з друку яго першы зборнік вершаў «Край мой сінявокі», які даў падставу крытыкам даволі высока ацаніць яго раннія паэтычныя спробы, бо і сапраўды малады аўтар ужо ў пачатку сваёй дарогі змог выявіць сябе ярка і пераканаўча, прыкметы яго стылявой адметнасці, хай сабе і контурна, усё ж выявіліся ў названай кнізе даволі выразна.

Зборнік уключае вершы, створаныя паэтам прыблізна на працягу сямі гадоў.

Малады паэт, нягледзячы на сваю нявопытнасць, ужо ўсведамляе вялікую адказнасць і складанасць працы ў сферы мастацкага слова. Магчыма, гэтым і тлумачыцца тое, што ён не спяшаўся з публікацыяй новых сваіх кніг і толькі ў 1969 г. выйшаў у свет другі зборнік вершаў пісьменніка — «Жураўліны досвітак». Роля гэтай кнігі ў творчай біяграфіі мастака, безумоўна, іншая, чым першай, бо ў ёй ужо выпадковасць саступае месца заканамернасці мастацкага развіцця, фарміруюцца асноўныя творчыя погляды паэта, сістэма яго асноўных жанраў, вобразна-выяўленчых сродкаў, вызначаюцца галоўныя напрамкі ідэйна-тэматычнага руху.

Наступная кніга У. Карызны «Святло ліўня» (1972) з'явілася больш адшліфаванай, больш «сталай» у параўнанні з першымі.

У ёй паэт здолеў перайсці ад простай назіральнасці за рэчаіснасцю да глыбокага асэнсавання пэўных яе праяў, знайсці заканамернасці ў выпадковым, у звычайным — узвышанае, боскае, у штодзённасці — свята, радасць.

У кнізе «Святло ліўня» У. Карызна шмат увагі ўдзяляе асэнсаванню ваеннай тэматыкі, звяртаецца да паказу сувязі і еднасці часоў і пакаленняў. Боль перажытага падчас вайны выявіўся з новай сілай у вершы «Асвенцім».

Усе 1960-я і першая палова 1970-х гадоў сталі для У. Карызны часам накаплення жыццёвага і творчага вопыту. Ён быў захоплены праявамі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, нараджэннем новага жыцця, шукаў у ім гармонію, часцінкі пазітыўнага пачатку, каб адлюстраваць усё гэта ў сваёй паэзіі, вартасць якой асабліва відавочная сёння, праз амаль пяцідзесяцігадовую часавую адлегласць: паэт здолеў занатаваць наяўнасць перамен да лепшага, адшукаць сапраўдныя каштоўнасці. І рабіў ён гэта з юнацкім запалам, па-максімалісцку, рашуча і смела. Вера — надзея — каханне — сумленнасць — шчырасць — малая радзіма — мова — прырода — памяць вайны — вось дамінантныя сімвалы яго творчасці. Агульначалавечыя каштоўнасці сталі для яго выразным арыенцірам, а жыццесцвярджальны пафас — ідэйнай асновай паэзіі. І пафас гэты меў такія кампаненты, як гераізацыя, узвышэнне з'яў і пачуццяў, узрушанасць перажыванняў, рамантызаваная вобразнасць.

Вершы паэта другой паловы 1970—1980-х гадоў выяўляюць усё тое лепшае, чаго дасягнуў майстар слова ў папярэднія гады. Паэт зноў вяртаецца на сваю малую радзіму і вядзе шчырую размову з навакольным асяроддзем, з Матухнай-прыродай, бацькоўскай хатай, рэкамі і азёрамі, дубровамі і гаямі і сваімі ўлюбёнымі птушкамі — буслямі.

Зборнікі паэта 1980—1990-х гадоў сведчаць аб яго вернасці метафарычнаму, вобразнаму, а значыцца — найбольш архаічнаму светаўяўленню. Свежасць паэтычнага бачання, схільнасць да яркай метафарычнасці, да канкрэтнага ўспрымання, эмацыянальны радок — усё гэта вартасці паэзіі У. Карызны, вызначаныя спецыфікай яго вобразнага мыслення. Паэт імкнецца паказаць унутраны стан

чалавека, які ўсімі карэннямі звязаны з роднай зямлёй, з народам, усім ачалавечаным светам і, самае галоўнае, з песняй.

Наватарскай і цікавай з'явай у творчасці пісьменніка названага перыяду становіцца цыкл вершаў «в'етнамскай тэматыкі», што з'явіўся пасля наведвання У. Карызнам гэтай краіны («В'етнамскім сябрам», «Паэты В'етнама», «Дзяўчына з горада Намдзінь», «Дзеці» і інш.). Паэт часта праводзіць аналогію паміж страчаным дзяцінствам і зруйнаванымі гарадамі Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны з вайной у В'етнаме.

Поруч з «в'етнамскім цыклам» у названым зборніку прысутнічаюць вершы вострай сацыяльнай праблематыкі, прысвечаныя Амерыцы («У Нью-Йорку», «На мітынгу», «Расколіна на звоне», «Не спіцца Амерыцы», «Хмарачосы» і інш.).

У канцы XX — пачатку XXI ст. У. Карызна шмат друкуецца: выходзяць зборнікі «Азёры дабрыні» (1995), «Хвіліна святла» (2000, 2003), «Доля Русь наша Белая» (2007), «Зарніцы дзяцінства» (2014), у якіх пісьменнік звяртаецца да ваеннага мінулага і драматычнага сённяшняга дня, актыўна выкарыстоўвае дыдактычна-павучальны пачатак, амаль кожны твор паэта — пацвярджэнне гэтаму, кожная фраза вучыць жыць і думаць, рыхтавацца да жыцця ці да смерці.

Лірыка У. Карызны гэтага часу дастаткова багатая ў жанравым і тэматычным аспекце: тэмы радзімы, родных вытокаў, бацькоўскай хаты, роднай мовы, чалавека і прыроды, ваеннага ліхалецця арганічна ўвайшлі ў творчы арсенал паэта.

Багаты пласт песеннай лірыкі У. Карызны вельмі шырокі і пастаянна папаўняецца. Трэба згадаць творчы тандэм з сынам Уладзімірам, які стаў своеасаблівай візітоўкай пісьменніка.

**Паэтычныя зборнікі:**

- «Край мой сінявокі» («Край мой синеглазый») (1963)
- «Жураўліны досвітак» («Журавлиный рассвет») (1969)
- «Святло ліўня : вершы і паэма» («Свет ливня : стихотворения и поэма») (1972)
- «Цеплыня : паэма, вершы, песні» («Тепло : поэма, стихотворения, песни») (1977)
- «Цішыня баразны : вершы і паэма» («Тишина борозды : стихотворения и поэма») (1981)

• «Шумяць вербы : вершы, песні» («Шумят вербы : стихотворения, песни») (1982)
• «Музыка ў свеце» («Музыка в мире») (1985)
• «Расколіна на Звоне Свабоды» («Раскол на Колоколе Свободы») (1986)
• «Душы разгуканай мелодыя : вершы, паэмы, песні» («Мелодия распетой души : стихотворения, поэмы, песни») (1988)
• «Хвіліна святла : выбранае» («Минута света : избранное») (2000)
• «Доля Русь наша Белая : выбранае») («Доля Русь наша Белая») (2007)

Зборнікі паэзіі для дзяцей:
• «На сяле ў бабулі» («В деревне у бабушки») (1975)
• «Кыонг і яго сябры» («Кыонг и его друзья») (1982)
• «Малююць дзеці» («Рисуют дети») (с А. Вольским, 1984)
• «Зямля — два паўшар'і» («Земля — два полушария») (1988)
• «Мір і сонейка для ўсіх» («Мир и солнышко для всех») (1990)
• «На азёрах сініх» («На озёрах синих») (2000)
• «Чарўнае вочка : казкі» («Волшебный глазик : сказки») (2003)
• «Лепяць ластаўкі гняздзечкі : вершы, загадкі, казкі» («Лепят ласточки гнёзда : стихотворения, загадки, сказки») (20100.

Зборнікі песень:
• «Клубныя вечары» («Клубные вечера») (1979)
• «Люблю цябе, Белая Русь» («Люблю тебя, Белая Русь») (1984)
• «Салавей спявае» («Соловей поёт») (1990)

Ён уганараваны шматлікімі ўзнагародамі і адзнакамі, з'яўляецца лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1996), кавалерам ордэна Францыска Скарыны (2002).

**Узнагароды і званні:**

• Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь (1996) за ўдзел у стварэнні серыі кніг серыі “Бібліятэка дзіцячай літаратуры народаў СССР”
• Ордэн Францыска Скарыны (2002) за ўдзел у дапрацоўцы тэксту (савецкі варыянт М. Клімковіча) Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь
• Літаратурная прэмія «Залаты купідон» (2007)

• Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (2008)
• Прэмія прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь.

**Творы:**

Карызна, У. І. Азёры дабрыні : вершы / Уладзімір Карызна ; [мастак М. С. Будавей]. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. - 173, [1] с. - (Бібліятэка беларускай паэзіі). ББК 84(4Беі)

Карызна, Ул. Беларуская песня : [верш : для малодшага школьнага ўзросту) / Уладзімір Карызна ; [малюнкі С. Волкава] // Вясёлка. - 2023. — №5. — С.10. ББК М81

Карызна, У. І. Доля Русь наша Белая : вершы, паэмы, песні / Уладзімір Карызна. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. - 334с.. - (Беларуская паэзія XX стагоддзя). ББК 84(4Беі)

Карызна, У. І. Душы разгуканай мелодыя : вершы, паэмы, песні / У.І.Карызна. - Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. - 269с. ББК 84(4Беі)

Карызна, У. І. Зарніцы дзяцінства : выбранае / Уладзімір Карызна. - Мінск : Звязда , 2014. - 255с. ББК 84(4Беі)

Карызна, У. І. Іграй, жалейка, не змаўкай... : вершы, казкі, небыліцы, лічылкі, загадкі, паэмы / Уладзімір Карызна ; [мастак Т. Беразенская]. - Мінск : Юнацтва, 1998. - 270, [1] с. ББК 84(4Беі)

Карызна, У. І. Кыонг і яго сябры : вершы / У.І.Карызна ; мастак У. Малахаў. - Мінск : Юнацтва, 1982. - 24с. ББК Д

Карызна, У. І. Лепяць ластаўкі гняздзечкі : вершы, загадкі, казкі / Уладзімір Карызна ; [мастакі: Т. Беразецкая, Н. Каламейцава]. - Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. - 135 с. ББК 84(4Беі)

Карызна, У. І. Мір і сонейка - для ўсіх : вершы, казкі, небыліцы, лічылкі, загадкі, паэма / Уладзімір Карызна ; мастак В. Тарасаў. - Мінск : Юнацтва, 1990. - 247 с. ББК Д

Карызна, У. І. На азёрах сініх : лірыка : [для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту] / Уладзімір Карызна ; [мастак В. А. Макаранка]. - Москва : Полымя, 2000. - 429с. - (Школьная бібліятэка). ББК 84(4Беі)

Карызна, У. І. Насціна кніжка : вершы, казкі, загадкі / Уладзімір Карызна ; [мастак Г. В. Шапялевіч]. - Мінск : Юнацтва, 1995. - 78, [2] с. ББК 84(4Беі)

Карызна, У. І. Цішыня баразны : вершы і паэма / У.І.Карызна. - Мінск : Мастацкая літітартура, 1981. - 79с. ББК 84(4Беі)

Карызна, У. І. Чароўнае вочка : казкі : [для малодшага школьнага ўзросту] / Уладзімір Карызна ; [мастак Р. М. Цімохава]. - Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. - 143с. ББК 84(4Беі)

Карызна,У.У. Жывая крыніца : выбраныя хоры і песні Уладзіміра Карызны (сына) на вершы Уладзіміра Карызны (бацькі) / Уладзімір Уладзіміравіч Карызна, Уладзімір Іванавіч Карызна ; [адказны за выпуск І. В. Рэзько]. - Мінск : Харвест, 2013. - 159с. ББК 85.9

Карызна, У. Хвіліна святла : выбранае / Уладзімір Карызна ; [прадмова В.Гардзея]. - Мінск : Харвест, 2003. - 383с. ББК 84(4Беі)

**Аб Уладзіміре Карызне:**

Андреева, Ю. "Слаўся,зямлі нашай светлае імя". История Государственного гимна захватывающая и полна неожиданностей / Юлия Андреева // Беларуская думка. - 2023. — №5. — С. 10-18 . ББК М81

Валуев, И. Один из авторов гимна Беларуси — наш земляк / Иван Валуев // Прысталічча. - 2022. — 18 мая. — С.12. ББК М81

Верасень, М. Уладзіміру Карызну спаўняецца 80 гадоў [Электронны рэсурс] / Марына Верасень ; [фота К. Дробава] // Звязда. – 2018. – 26 мая. – Рэжым доступу : https://zviazda.by/ru/node/134154

Весялуха, М. Кампазітар Уладзімір Карызна: «Добрая музыка выхоўвае чалавека» [Электронны рэсурс] / Марына Весялуха // Звязда. – 2016. – 30 кастр. – Рэжым доступу : https://zviazda.by/ru/node/91956.

Гоўзіч, І.А. Жанрава-стылёвыя пошукі Уладзіміра Карызны (да 80-годдзя з дня нарадджэння паэта) [Электронны рэсурс] / І. А. Гоўзі // Весці БДПУ. – 2018. – № 3. – Сер . 1. – С. 112 – 116. – Рэжым доступу : https://elib.bspu.by/bitstream/doc/40102/1/120183112.pdf?ysclid=lhrfvdn6ya965039322

Каризна Владимир Иванович // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т- х. Т. 3. - Минск, 2006. - С. 885 - 886.

Каризна Владимир Иванович // Минская область : энциклопедия : в 2 т -х. Т.2. – Минск, 2007. - С. 144-145

Карызна Уладзімір // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфичны слоўник : у 6 т-х. Т.3 / пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса. - Мінск, 1994. - С.202 - 204.

Карызна Уладзімір Іванавіч // Беларускі фальклор : энцыклапедыя. Т.1. - Мінск, 2005. - С.668 - 669.

Марціновіч, А. Прыветнай песні адгалосе / Алесь Марціновіч // ЛіМ.Літаратура і мастацтва. - 2023. — 19 мая. — С.4.

Суббот, В. Один из авторов Государственного гимна Беларуси – известный поэт Владимир Каризна: есть хлеб – будет песня [Электронный ресурс] / Владзимир Суббот // СБ.Беларусь сегодня. – 2023. – 13 мая. – Режим доступа : https://www.sb.by/articles/adzin-z-a-tara-dzyarzha-naga-gimna-belarusi-vyadomy-paet-uladzimir-karyzna-galo-ny-muzychny-tvor-guch.html?ysclid=lhrgmc73vs207102697

Уладзімір Карызна // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Мінскага раёна. - Мінск, 1998. - С.511.

Уладзімір Карызна // Беларускія пісьменнікі (1917 - 1990) : даведнік / складальнік А. К. Гардзіцкі. - Мінск, 1994. - С.268.

Уладзімір Карызна (нар.1938) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://elib.bspu.by/bitstream/doc/57623/1/uladz_m_r_karyzna.pdf?ysclid=lhrdsmqge3993260760

Уладзімір Карызна: «Больш Радзіму не аддадзім. Хопіць, што ў нас Савецкі Саюз скралі» [Электронны рэсурс] // СБ.Беларусь сегодня. – 2021. – 8 чэрв. – Рэжым доступу : https://www.sb.by/articles/uladzimir-karyzna-bolsh-radzimu-ne-addadzim-khopits-shto-nas-savetski-sayuz-skrali.html

***ДУ "Мінская раённая цэнтральная бібліятэка"***

***Адрас:*** а/г Міханавічы, вул. Школьная, 23

***Тэлефон:*** 515-29-72

***Час работы:***
панядзелак – субота: 10.00 – 19.00

***Выходныя дні:*** нядзеля

***Санітарны дзень:*** першая серада месяца

***Сайт:*** https://minskaya-rcb.by/

***ВКонтакте: Минская Рцб:*** https://vk.com/id483156480

***Віртуальны кабінет:***